А.П. Шимков. Тираж журнала составлял до 12 тыс. экз. [13, с. 22]; подписная стоимость на год – 2 руб. Газета ставила своей целью распространять в общедоступной форме сельскохозяйственные знания применительно к потребностям сельских хозяев Полтавской и соседних с нею губерний, способствовать взаимному общению сельских хозяев и сельскохозяйственных обществ Полтавской губернии, предоставлять своим читателям своевременную информацию о правительственных мероприятиях, деятельности земств и сельскохозяйственных обществ в области народного хозяйства. Особую заботу издания составляли дешевизна газеты и общедоступность изложения. С 1898 г. департаментом народного просвещения «Хуторянин» был допущен в бесплатные народные библиотеки и читальни [10, с. 329]; в 1902 г. газета пополнила библиотеки сельскохозяйственных учебных заведений министерства земледелия [7, с. 318].

В целом периодические издания представительных союзов предпринимателей объединяли в себе характерные черты либеральной прессы и особенности интересов торгово-промышленных кругов. Издательская деятельность корпораций предпринимателей, кроме информационного, научного и культурного значения, была весомым инструментом влияния на государственную экономическую политику, средством реализации представительных функций общественных объединений, методом популяризации их взглядов среди широких слоев общества. Само наличие или отсутствие периодических изданий было показателем уровня организованности предпринимателей.

Комплексное изучение материалов периодических изданий представительных организаций второй половины XIX – начала XX вв. позволяет проследить отличия в оценках предпринимателями, правительством и общественностью основных явлений и процессов периода рыночных трансформаций. Журналы представительных союзов предпринимателей являются одним из главных источников по истории самих этих объединений. Многочисленные материалы, опубликованные в них, являются необходимой составляющей воссоздания целостной исторической картины тех времен.


1. Гушка, А. О. Представительные организации торгово-промышленного класса в России / А. О. Гушка // Записки Императорского русского технического общества. – 1912. – № 6–7. – С. 203–226.
2. Деятельность Киевского общества сельского хозяйства // Земледелие. – 1888. – № 3. – С. 34–36.
3. Деятельность Киевского общества сельского хозяйства // Земледелие. – 1891. – № 27. – С. 222.
4. Из сельскохозяйственной печати // Хуторянин. – 1912. – № 49. – С. 1195–1196.
5. От редакции // Земледелие. – 1888. – № 3. – С. 597–598.
6. От редакции // Земледелие. – 1888. – № 6. – С. 73–74.
7. От редакции // Хуторянин. – 1902. – № 17. – С. 318.
8. От редакции // Южно-русский горный листок. – 1880. – № 1. – С. 1–2.
9. Труды X съезда горнопромышленников юга России, бывшего в городе Харькове с 20-го ноября по 8-е декабря 1885 г. – Ч. 1. Доклады. – Харьков : Типография Каплана и Бирюкова, 1886. – [разд. паг.].
10. Хроника // Хуторянин. – 1898. – № 20. – С. 329–330.
11. Центральний державний історичний архів України, м. Київ. – Ф. 1680. Оп. 1. Спр. 25.
12. Цели и задачи нашего журнала // Торгово-промышленный юг. – 1911. – № 1. – С. 2–16.
13. Черепахов, М. С. Русская периодическая печать (1895 – октябрь 1917) : справочник / М. С. Черепахов, Е. М. Фингерит. – М. : Госполитиздат, 1957. – 351 с.
14. Черменский, Е. Д. Буржуазия и царизм в революции 1905–1907 гг. / Е. Д. Черменский. – М., Л. : Государственное социально-экономическое издательство, 1939. – 376 с.
15. Шобер, Ф. Наша торгово-промышленная печать / Ф. Шобер // Промышленность и торговля. – 1911. – № 1. – С. 14–17.



**Мяньчэня С.В.**


## КАРЭСПАНДЭНЦЫЯ І ДАНЯСЕННІ ЧЛЕНАЎ ПАПЯЧЫЦЕЛЬСТВАЎ АБ НАРОДНАЙ ЦВЯРОЗАСЦІ ЯК КРЫНІЦЫ ПА ВЫВУЧЭННІ КУЛЬТУРЫ СПАЖЫВАННЯ АЛКАГОЛЮ Ў БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.

Культура спажывання алкагольных напояў уяўляе сабой традыцыі і звязаныя з імі рытуалы і дзеянні спажывання алкагольных напояў. Дадзеная праблематыка мае важнае значэнне для вывучэння паўсядзённага жыцця грамадства. З 1897 г. у беларускіх губернях была ўведзена дзяржаўная “вінная” манаполія – улады ўзялі пад свой кантроль выраб і продаж моцных спіртных напояў. Забараняўся продаж гарэлкі ў крэдыт, абмяжоўваўся час продажу, ліквідоўваліся корчмы. Планавалася, што гэта дазволіць скараціць спажыванне алкаголя і прымусіць аматараў піць дома пад наглядам сям’і. Для нагляду за правядзе ннем рэформы і абмежавання насельніцтва ад празмернага спажывання алкаголя ствараліся камітэты папячыцельства аб народнай цвярозасці. Дакументы папячыцельстваў даюць магчымасць прасачыць, як

змянілася культура і памеры спажывання алкаголя, а таксама стаўленне розных слаёў грамадства да гэтых мерапрыемстваў.

З пачаткам рэформы да папячыцельстваў звярнулася рэдакцыя часопіса “Вестник Финансов, Промышленности и Торговли”, які выдаваўся Міністэрствам фінансаў. Членам папячыцельстваў прапаноўвалася рэгулярна дасылаць свае назіранні па наступных пытаннях: адносіны насельніцтва да рэформы (ці сустракаецца супрацьдзеянне); памеры і формы спажывання “казённага віна”; ці замяняецца непамернае і беспадаркавае спажыванне рэгулярнай і упарадкаванай пакупкай; якасць алкаголя і г.д. [2, спр. 15, арк. 20]. Карэспандэнцыя друкавалася ў раздзеле “З раёнаў віннай манаполіі” ананімна, але з пазначэннем населенага пункта і губерні. Карэспандэнцыя дасылалася з розных куткоў імперыі, што дае магчымасць параўнаць традыцыі і паводзіны жыхароў розных рэгіёнаў. Яшчэ адной крыніцай інфармацыі па культуры спажывання алкаголя выступаюць данясенні і справаздачы членаў папячыцельстваў у павятовыя і губернскія камітэты.

Карэспандэнцыя з розных куткоў Беларусі адрознівалася толькі ў асобных выпадках пры вызначэнні вынікаў рэформы. З Брагіна паведмлялі, што “п’янства адчувальна зменшылася”, з Ігумена – “спажыванне віна не скарацілася, але знізілася злачыннасць”, з Рэчыцы – “п’янства не скарацілася, бо адлегласць паміж кропкамі продажу зменшылася” [3, спр. 2, арк. 40, 46]. Але ў пераважнай большасці адзначаюцца факты росту вулічнага п’янства, што было выклікана ліквідацыяй корчмаў і арганізацыяй продажу гарэлкі на вынас. Данясенне члена Магілёўскага павятовага камітэта: “Насельніцтва да рэформы адносіцца па-рознаму: адныя кажуць, што і гарэлка лепей, і падману па грошах няма, а іншыя, што гатовы і залішнюю капейку заплаціць, але каб ў цяпле выпіць, ды пры месцы, ў краме не дазваляюць, а на вуліцах гарадавыя разганяюць – і выпіць прыстойнаму чалавеку няма дзе …Яшчэ загадзя да адкрыцця крамы натоўп збіраецца каля дзвярэй і чакае моманта, калі можна будзе па іх выразу “прычасціцца” [3, арк. 15 ад]. “Культурнае” спажыванне – дома з закускай, не распаўсюджвалася, наадварот п’янства выйшла з корчмаў на вуліцу і стала даступным, а тым больш бачным для большасці слаёў насельніцтва.

Тым не менш былі і пазітыўныя моманты. Характарызуючы ранейшыя звычкі рэспандэнт з сяла Вялікі Рожын Мінскай губерні адзначае існаваўшую ў XIX ст. традыцыю “піць на чорнага вала”: “прыйдзе палешук у карчму, пачне піць і не выйдзе пакуль не прап’е адзін ці з кумам вала” [3, спр. 2, арк. 45]. Новая сістэма продажу забараняла продаж віна не за грашовыя сродкі і ў крэдыт і не дазваляла разгарнуцца да такога памеру.

Сярод дакументаў папячыцельстваў аб народнай цвярозасці можна знайсці і апісанне культуры піцця суседзяў беларусаў. Загадчык чайной у мястэчку Крэйцбург Двінскага павета Віцебскай губерні (сёння тэрыторыя Латвіі) участковы папячыцель прыстаў П’янкоў ў лютым 1898 г. накіраваў у губернскі камітэт ліст са сваімі назіраннямі і прапановамі. Тут ён дае параўнальную характарыстыку звычкам латышоў і беларусаў. П'янкоў адзначае заможнасць і адукаванасць латышскага насельніцтва, высокі ўзровень культуры нават сярод сялян, але разам з тым звяртае ўвагу на большую іх схільнасць да спажывання спіртных напояў “латыш запар і побач п'е спірт і п'е яго ў такой колькасці, што нашаму б беларусу ад 1/10 гэтай колькасці не падняцца б на ногі. Латыш не п'е сівухі, гарэлку ён любіць з прытраўкай, ён вельмі любіць каньяк”. Яшчэ адной заганай латышскага насельніцтва аўтар называе спажыванне эфіру [2, спр. 13, арк. 32 адв.].

Асобна трэба адзначыць інфармацыю, якая датычыцца яўрэйскага насельніцтва. Пад уплывам некаторых фактараў рэлігійнага і сацыяльнага характару яўрэі амаль не спажывалі гарэлкі самі, але да ўвядзення манаполіі з’яўляліся карчмарамі. Такая сітуацыя ў пэўнай ступені спрыяла фарміраванню дзяржаўнага і пабытовага антысемітызму. Новая сістэма вызначала сваё стаўленне да яўрэйскага насельніцтва словамі аднаго з кіраўнікоў павятовага камітэта Віцебскай губерні: “галоўнае зло заключаецца не столькі ў злоўжыванні спіртнымі напоямі з боку насельніцтва, колькі ад піцейных устаноў прынятага тыпу з яго габрэем-сядзельцам або карчмаром, мэта якога заключаецца ў спаіванні наведвальніка да самазабыцця” [2, арк. 2].

Участковы папячыцель з мястэчка Івянец Мінскай губерніі паведамляў: “кожным яўрэем-домаўладальнікам купляецца ў казённай краме вялікая колькасць гарэлкі, якая ў кожную пару дня і ночы прадаецца імі. Усё гэта робіцца беспакарана, так што яўрэі, што гандлююць гарэлкай кажуць, што ім у дні Саламона не было так добра, як ў наш час” [1, арк. 18]. Сяляне з мястэчка Круглае Магілёўскага павета ў лісце да губернатара ў сакавіку 1906 г. прасілі мясцовую чайную бо “пазбавіць нас чайной значыць пазбавіць духоўнай ежы і света і аддаць у яўрэйскія рукі.. Зноў будзем шукаць прытулку ў яўрэйскіх прытонах, дзе нас будуць абдзіраць і падман-

ваць” [3, спр. 4, арк. 17]. Такім чынам бачна, што незадаволенасць яўрэйскім насельніцтвам у плане пытання распаўсюджвання алкаголя датычылася як прадстаўнікоў дзяржаўных устаноў, так і мясцовай інтэлігенцыі і сялян.

Дзяржаўная манаполія выклікала і рост самагонаварэння, пры чым не заўсёды з бяспечных складаючых. Згодна з данясеннем у Дзвінскі камітэт: “некаторыя грамадзяне, у асноўным з яўрэйскага насельніцтва, наладзілі выраб таннай гарэлкі з палітуры і лаку, яны аб'язджалі наваколлі ў пошуках кліентаў і па папярэдняй змове на месцы арганізоўвалі патаемную вытворчасць” [2, спр. 35, арк. 37 адв.]. Карэспандэнт з мястэчку Свіслач Мінскай губерні адзначае, што “на месцах арганізаваны і прыватны выраб гарэлкі, але вінаватых не знайшлі, толькі апараты” [3, спр. 2, арк. 46].

Яшчэ адной новай з’явай становіцца змешванне алкагольных напояў, з мэтай хутчэйшага і мацнейшага ап’янення. Згаданы вышэй карэспандэнт з в. Вялікі Рожын паведамляе: “вяселлі ў сялян спажывалі 10–12 вёдзер сівухі *(1 вядро – 12,3 л – М.С.)*, зараз - 2-3 вядра, астатняе замяняюць пакупнымі мядамі, якія змешваюць з гарэлкай, каб хутчэй давала ў галаву” [3, спр. 2, арк. 45]. У Люцынскім павеце Віцебскай губерні мясцовыя жыхары “да ўвядзення манаполіі варылі піва для ўласнага спажывання ў святочныя дні, а зараз назіраецца паўсядзённае спажыванне піва, якое варыцца моцным і адурманьваючым каб замяніць казённае віно” [2, арк. 81].

Цікавая інфармацыя датычыцца нелегальнага продажу алкаголя і ўзаемаадносін паміж пакупнікамі і прадаўцамі. Члены папячыцельстваў аб народнай цвярозасці былі зацікаўлены ў выяўленні такіх выпадкаў не толькі з-за мэтаў сваёй дзейнасці, але і з-за фінансавага пытання, бо штрафы з парушальнікаў ішлі на іх карысць. Аднак негледзячы на рост нелегальнага продажу затрымаць прадаўцоў было дастаткова цяжка, акрамя таго не ўсе члены камітэта жадалі займацца гэтымі справамі, асцерагаючыся са свае адносіны з суседзямі і пагроз з боку абвінавачаных. Пакупнікі з свайго боку не ў якіх умовах не жадалі выдаваць людзей, якія прадавалі ім алкаголь, каб не пазбавіцца кропкі, дзе можна было знайсці гарэлку ў любы час. Не спрыялі выкрыццю і бюракратызм і пасіўнасць дзяржаўных устаноў. З Рэжыцкага павета Віцебскай губерні настаўнік Арлоў паведамляў, што склаў на селяніна Лявона Гаўрылава пратакол, але мясцовы дзесяцкі атрымаў ад апошняга 6,5 рублёў і закрыў справу. У другім выпадку ураднік адмовіўся праехаць з Арловым ў карчму для правядзення вобыска наконт нелегальнага продажу [2, спр. 35, арк. 20, 43 адв.]. Нажаль, дакументы не даюць магчымасці прасачыць далейшы лёс энергічнага настаўніка.

Але і ў выпадку складання пратаколу і перадачы справы ў суд не заўсёды можна было чакаць пасяховага выніку. Так, з 8 пратаколаў, складзеных адным з папячыцеляў Магілёва, толькі па 4 быў вынесены абвінаваючы прысуд, і асобы, што ажыццяўлялі нелегальны гандаль, атрымалі па 4 месяцы турмы. У астатніх выпадках сведкі на судзе мянялі паказанні і апраўдвалі падсудных [3, арк. 12]. У мястэчку Свіслач Мінскай губерні “просты люд на першых парах аднёсся да рэформы са спачуваннем і рабіў заявы на нелегальных прадаўцоў, але з-за плётак яўрэяў аб тым, што сведкаў таксама будуць кідаць у турму, ахладзеў да рэформы і стаў па-ранейшаму п’янстваваць у яўрэйскіх дамах” [3, спр. 2, арк. 46].

Такім чынам можна зазначыць, што данясенні, справаздачы і карэспандэнцыя членаў камітэтаў папячыцельстваў аб народнай цвярозасці ўяўляюць сабой комплекс цікавых і карысных для даследчыкаў матэрыялаў па культуры спажывання алкагольных напояў, гісторыі паўсядзённага жыцця насельніцтва і міжнацыянальных адносін у Беларусі на мяжы XIX – XX стст.

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 132. Воп. 1. Спр. 1.
2. НГАБ. – Ф. 2709. Воп. 1. Спр. 4.
3. НГАБ . – Ф.2296. Воп. 1. Спр. 1.

**Півавар М.В.**

## «СПРАВАЗДАЧЫ АБ ДЗЕЯННЯХ ТАВАРЫСТВА ВІЦЕБСКІХ СЕЛЬСКІХ ГАСПАДАРОЎ» ЯК КРЫНІЦА ПА ВЫВУЧЭННІ ВІЦЕБШЧЫНЫ

Віцебскае таварыства вольных гаспадароў іcнавала ў Віцебску з 1881 па 1917 г. і адыграла важную ролю ў развіцці сельскай гаспадаркі, пашырэнні аграномічных ведаў і агульнай культуры на Віцебшчыне. Дзейнасць таварыства і яго роля ў развіцці эканоміцы краю мала вывучаны. Звязана гэта ў асноўным з абмежаванай крыніцазнаўчай базай. Дакументы Таварыства ў асноўным захоўваюцца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. Іх выкарыстанне